© PDF: Kamunikat.org 2010
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Чарнобыльскі хлопчык у амерыканскай сям'і (стар 4.)
Будзем рабіць жыццё з таварыша Дзяржынскага? (стар 4.)

СВАБОДА

Год заснавання 1902
Выходзіць з 1990
Галоўны рэдактар Ігар Германчук
Заснавальнік Павел Жук
Выдавец – рэдакцыя газеты СВАБОДА
Наклад 90.000
Адрас рэдакцыі:
220088, Мінск, вул.Іванаўская, 56
Тэл./факс 2 362 441

Пятніца, 22 жніўня 1997 г. | № 92 | Кошт свабодны

Свабоду слова – на Беларусь

Пікет пад назвай «Свабоду слова — на Беларусь» правялі ў сераду на мінскай плошчы Я.Коласа журналісты беларускіх недзяржаўных СМІ.



На здымку: журналісты ў пікеце

Сярод пікетчыкаў, якія трымалі плакаты з надпісамі *«Свабоду журналістам»*, *«Свабоду слова — на Беларусь»*, знаходзілася і маці дырэктара беларускага бюро ОРТ Паўла Шарамета, які ўжо амаль месяц сядзіць у Гродзенскім СІЗО. Спн.Шарамет абвергла распаўсюджаную некаторымі афіцыйнымі СМІ інфармацыю аб тым, нібыта яна звярнулася да Лукашэнкі з просьбай вызваліць сына. *«Гэтага чалавека я ніколі ні аб чым прасіць не збіраюся,* — сказала маці Паўла. — *А свой зварот я накіравала на імя Ельцына і Клінтана»*. Па словах арганізатараў пікета, сваёй акцыяй журналісты хочуць прыцягнуць увагу крамлёўскага кіраўніцтва да лёсу сем'яў зняволеных расійскіх журналістаў. *«Але ў прынцыпе гэта пікет у падтрымку ўсіх журналістаў»*, — сказаў намеснік рэдактара штотыднёвіка «Имя» Мікалай Халезін. *«Я не ведаю, хто наступны апынецца за кратамі, у нас гэта ведае толькі прэзідэнт... Хочацца нагадаць уладам, што вайну, развязаную супраць прэсы, нідзе і ніколі ўлады не выйгравалі. Можна пасадзіць яшчэ 20—30 журналістаў, закрыць некалькі газет, але іх выхад усё роўна адновіцца — у грамадстве заўсёды ёсць патрэбнасць у разнастайнай інфармацыі»*, — заявіў Халезін у інтэрв'ю агенцтву БелаПАН.

Прадстаўнікі беларускіх незалежных СМІ падалі ўчора ў Мінскі гарвыканкам заяўку на правядзенне 30 жніўня ў Мінску шэсця ў абарону правоў журналістаў.

Альгерд НЕВЯРОЎСКІ

Беларускія ўлады ўзмацняюць рэпрэсіі супраць журналістаў

Крэмль прачнуўся

Міністэрства замежных справаў РБ звярнулася ў Савет міністраў з просьбай прыпыніць дзейнасць беларускага бюро ОРТ.

Пра гэта паведаміў у сераду на брыфінгу намеснік кіраўніка прэзідэнцкай адміністрацыі Іван Пашкевіч. Ён зачытаў урыўкі стэнаграмы праслуханых тэлефонных перамоваў карэспандэнтаў ОРТ Уладзіміра Фашэнкі і Анатоля Адамчука. Былі названыя і прозвішчы *«сапраўдных арганізатараў правакацыі на граніцы»*, а менавіта: генеральны дырэктар інфармацыйных праграмаў ОРТ Андрэй Васільеў, ягоны намеснік Грыгорый Райтнэр і загадчык карэспандэнцкай сеткі па краінах СНД Аляксандр Шкіранда. Гэтыя людзі быццам бы загадалі Адамчуку выехаць на беларуска-літоўскую граніцу і, пераступіўшы памежную лінію, зачытаць перад камерай зварот да Лукашэнкі і Ельцына з патрабаваннем вызваліць здымачную групу Паўла Шарамета. 20 жніўня ў беларускіх дзяржаўных газетах з'явіліся чарговыя «прызнанні» А.Адамчука. Ён сцвярджае, што з Масквы яму было дадзена ўказанне зрабіць *«гучны скандальны рэпартаж з Беларусі»*. Кіраўніцтва ОРТ нібыта прапанавала Адамчуку выехаць менавіта на той участак граніцы, дзе быў затрыманы Шарамет. Спачатку планавалася, што ў акцыі прыме ўдзел карэспандэнт яшчэ аднаго расійскага тэлеканала, але той адмовіўся. Тады, па словах Адамчука, з'явілася ідэя падключыць да гэтай акцыі беларускіх журналістаў, але ў апошні момант ад такога варыянту адмовіліся, і на мяжу выехала толькі здымачная група ОРТ.

Дарэчы, следства адразу ўхапілася за «беларускі след». Чатыры гадзіны правёў на допыце ў КДБ карэспандэнт «БДГ» Андрэй Махоўскі, павесткі выдадзены яшчэ некалькім беларускім журналістам. Улады сцвярджаюць, што следства ведае імёны і прозвішчы 10 журналістаў, якія былі ў курсе *«рыхтуемай правакацыі»*. Не выключана, што іх могуць прыцягнуць да крымінальнай адказнасці за *«саўдзел у падрыхтоўцы злачынства»*.

Іван Пашкевіч сцвярджае, што карэспандэнт ОРТ Уладзімір Фашэнка, які быў арыштаваны ў панядзелак, у бліжэйшы час будзе дэпартаваны з краіны. Па нашай інфармацыі, карэспандэнт беларускага бюро ОРТ Віктар Дзятлікові і адміністратар карпункта Дзмітрый Наважылаў, якіх актыўна шукае КДБ, цяпер знаходзяцца ў Маскве.

Учора расійскі пасол у Мінску Валерый Лашчынін вёў перамовы з прэзідэнтам Лукашэнкам на прадмет вызвалення расійскіх журналістаў. На момант здачы нумара ў друк вынікі сустрэчы заставаліся невядомымі.

Цікава паводзіць сябе шэф расійскага МЗС Яўген Прымакоў. У інтэрв'ю НТВ ён заявіў, што па ягонай інфармацыі ўсе затрыманыя ў Беларусі расійскія журналісты знаходзяцца пад... хатнім арыштам(?!) і даюць паказанні ў прысутнасці расійскіх дыпламатаў.

Між тым прэс-сакратар Ельцына Сяргей Ястржэмбскі агучыў афіцыйную заяву, з якой вынікае, што цярпенне Масквы ўжо на мяжы. *«Мы катэгарычна патрабуем ад беларускіх уладаў да канца дня вызваліць усіх журналістаў ОРТ, прычым як грамадзянаў Расіі, так і Беларусі»*, — сказаў учора Ястржэмбскі. У адваротным выпадку, падкрэсліў ён, будзе перагледжана саюзная дамова.

У адказ на заяву прэс-сакратара расійскага прэзідэнта Лукашэнка заявіў, што не дазволіць размаўляць з ім з пазіцыі сілы, і запатрабаваў ад Масквы тлумачэнняў наконт таго, хто ўпаўнаважыў Ястржэмбскага рабіць такую заяву. Рыгоравіч сказаў, што ён не выпусціць арыштаваных журналістаў, пакуль расійскі бок не прынясе яму прабачэнні за падобныя выказванні.

Альгерд НЕВЯРОЎСКІ

Ружа Свабоднай Прэсы

Выведзены селекцыянерамі Галандыі новы гатунак ружы атрымаў назву «Ружа Свабоднай Прэсы».

Першыя букеты новых кветак былі ўручаныя сёлета ў Амстэрдаме лаўрэатам «Залатога Пяра Свабоды» — узнагароды, якую штогод прысуджае журналістам Міжнародная асацыяцыя газет. У асацыяцыі спадзяюцца, што гэтая кветка стане сусветным сімвалам свабоднай прэсы.

На вывядзенне новых ружаў спатрэбілася 10 гадоў, у аснове гэтага гатунку — каля 5 тысяч розных гібрыдаў. Кветка спалучае чырвоны і белы колеры і, як сказалі селекцыянеры, можа расці *«толькі ў спрыяльных, дружалюбных умовах»*.

Ганна ШЫМЕЛЕВІЧ

Беларускім дзецям — беларускія школы

Пад такім лозунгам Таварыства беларускай мовы ладзіць у панядзелак (25 жніўня) у Мінску пікет з мэтай пратэсту супраць закрыцця беалрускіх класаў і школ. Пікет будзе праходзіць каля кінатэатра «Кіеў» з 17 да 19 ґадзінаў.

Аляксандр ШКУЦЬКО

Голас Еўрапарламента

Спецыяльны дакладчык па Беларусі ў Еўрапарламенце заклікае прэзідэнта Лукашэнку неадкладна вызваліць журналістаў ОРТ

«Пачуццё глыбокай трывогі ў сувязі з далейшай самаізаляцыяй Рэспублікі Беларусь вымушае мяне яшчэ раз звярнуцца да Вас з адкрытым пісьмом», —так пачынаецца зварот спецыяльнага дакладчыка па Беларусі ў Еўрапейскім парламенце Элізабет Шродтэр, адрасаваны прэзідэнту Аляксандру Лукашэнку.

Спадарыня Шродтэр паведамляе, што прычынай для напісання гэтага пісьма стаў арышт супрацоўнікаў ОРТ. Шродтэр звяртае ўвагу беларускага прэзідэнта на тое, што цяперашняя сітуацыя з выкананнем правоў чалавека на свабоду прэсы і свабоду слова ў Беларусі супярэчыць пастановам, прынятым на Будапешцкім саміце АБСЕ ў 1994 годзе. У гэтых пастановах, якія былі падпісаныя таксама беларускім прэзідэнтам, у прыватнасці гаворыцца: «Краіны-удзельніцы канстатуюць, што свабода слова з'яўляецца адным з асноўных кампанентаў дэмакратычнага грамадства. У сувязі з гэтым незалежныя і плюралістычныя сродкі масавай інфармацыі з'яўляюцца фундаментальнай умовай свабоднага і адкрытага грамадства».

Спадарыня Шродтэр адзначае, што супрацоўнікі ОРТ працягваюць утрымлівацца пад вартай, нягледзячы на пратэсты з боку кіраўніцтва Расіі і многіх міжнародных праваабарончых арганізацый. На яе думку, пераслед журналістаў ОРТ сведчыць аб кампаніі, развязанай беларускімі ўладамі супраць незалежных СМІ. У сувязі з гэтым спадарыня Шродтэр адзначае, што, згодна з прыведзеным вышэй палажэннем Будапешцкага саміту АБСЕ, еўрапейская супольнасць не можа пакінуць без увагі рэпрэсіі супраць незалежнай прэсы ў Беларусі, бо рэспубліка з'яўляецца часткай Еўропы і павінна паважаць такія каштоўнасці, як свабода, дэмакратыя і правы чалавека, прызнаныя ва ўсім свеце.

«Як член Еўрапейскага парламента і дакладчык па Беларусі, я настойліва заклікаю вас, — звяртаецца спадарыня Шродтэр да Аляксандра Лукашэнкі, — вызваліць затрыманых журналістаў і спыніць распачаты супраць іх крымінальны пераслед, даць ім магчымасць бесперашкодна працаваць у вашай краіне; прыняць захады да неадкладнага спынення ўсіх спробаў запалохвання і пераследу журналістаў; забяспечыць доступ незалежных СМІ да дзяржаўных друкарняў, тэлебачання і радыё; спыніць прыняцце дыскрымінацыйнага законапраекта аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі; гарантаваць незалежнай прэсе свабодны доступ да інфармацыі аб ходзе трохбаковых кансультацый паміж прадстаўнікамі беларускага кіраўніцтва, Вярхоўнага Савета 13-га склікання і еўрапейскіх арганізацыяў, а таксама гарантаваць, што іхнія рэпартажы не будуць падвергнутыя цэнзуры».

БелаПАН

Віктар Кучынскі «не будзе тормазам»?

Учора ў Мінскім міжнародным адукацыйным цэнтры пачалася канферэнцыя «Праекты беларуска-германскага супрацоўніцтва».

На яе сабраліся 40 беларускіх і 20 нямецкіх прадстаўнікоў партнёрскіх арганізацый і праектаў. Адно з балючых пытанняў, якое закранулі ў першы ж дзень, звязана з перашкодамі, што ўзнікаюць пры дастаўцы гуманітарнай дапамогі ў Беларусь. Упершыню публічна праясніць сітуацыю ўзяўся Віктар Кучынскі, шэф дэпартамента па гуманітарнай дапамозе пры прэзідэнце РБ.

Ён заявіў, што ў дэпартаменце будуць працаваць 17 дзяржаўных служачых, а пры іх створаць папячыцельскі савет. Але пакуль у дэпартаменце служыць толькі сам Кучынскі. Легендарны «гранатамётчык» заклікаў *«патэнцыяльных донараў з Германіі»* папярэдне інфармаваць яго пра тое, які груз яны падрыхтавалі да адпраўкі ў Беларусь, *«каб зняць усе праблемы па праходжанні праз мяжу»*.

Па словах Кучынскага, за час работы створаны ўказам дэпартамент падрыхтаваў каля 100 рашэнняў па пропуску «гуманітаркі» і ніводнага з іх *«прэзідэнт не вярнуў назад»*. Новаўвядзенні Кучынскага, аднак, дрэнна спрацоўваюць — гуманітарныя грузы часам доўга прастойваюць на мяжы. Віктар Кучынскі сцвярджае, што ягоны дэпартамент *«не будзе тормазам на шляху гуманітарнай дапамогі ў Беларусь, а створыць спрыяльныя ўмовы для вырашэння ўсіх праблем»*. Дэпартамент будзе выдаваць ліцэнзіі на права займацца гуманітарнай дапамогай і аздараўленнем дзяцей. Кучынскі паабяцаў, што ягоны дэпартамент *«не будзе ўмешвацца ў прыватнае жыццё грамадзян і статутную дзейнасць арганізацый, якія маюць справу з гуманітарнай дапамогай»*. У размове з карэспандэнтам СВАБОДЫ Віктар Кучынскі сказаў, што *«пакуль не збіраецца ламаць існуючую сістэму паступлення гуманітарнай дапамогі ў Беларусь, бо цяпер самы сезон»*. Новаўвядзенні чакаюцца з 1 студзеня 1998 года.

Шэф дэпартамента заклікаў нямецкіх донараў працягваць пастаўку гуманітарных грузаў у нашую краіну, заявіўшы, што *«палітыкі прыходзяць і сыходзяць, а людзі застаюцца»*. Па словах Кучынскага, сітуацыя ў Беларусі цяпер *«стабільная і кіруемая, а калі ёсць нейкія нюансы, то яны часовыя»*.

Алесь ДАШЧЫНСКІ

Паважаныя чытачы! Не забудзьцеся прадоўжыць падпіску на газету СВАБОДА

Кошт падпіскі на IV квартал — 75.000 руб., на адзін месяц — 25.000 руб.
Афарміць падпіску можна ў любым аддзяленні пошты і Белсаюздруку да 10 верасня

Наш індэкс **63887**

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Засцерагайцеся фальшывых долараў

Нацыянальны банк Беларусі папярэдзіў камерцыйныя банкі, што арганізаваныя крымінальныя групоўкі, якія спецыялізуюцца на вырабе і збыце падробленых грашовых купюр, якраз цяпер праводзяць акцыю па збыце фальшывых 100-доларавых банкнотаў ЗША праз рынкі наяўнай валюты Беларусі. Падробленыя грошы маюць выгляд банкнотаў новага ўзору (серыя АВ).

Ян ГАЛЕВІЧ

Рабочыя супраць дырэктара

Абстаноўка на Брэсцкім заводзе «Цветатрон», дзе нядаўна прайшла стыхійная забастоўка, працягвае заставацца складанай, нягледзячы на прадастаўленыя дзяржавай падатковыя льготы.

Прадпрыемству ўдалося ліквідаваць запазычанасць па зарплаце: грошы выплачаны за травень і чэрвень з улікам інфляцыі. Аднак рабочыя па-ранейшаму патрабуюць зняць з пасады дырэктара завода Міхаіла Урбана. Атрымаўшы забарону брэсцкіх уладаў на правядзенне пікетавання аблвыканкама, прадстаўнікі заводскай арганізацыі Свабоднага прафсаюза правялі пікет каля заводскай прахадной, патрабуючы змены кіраўніцтва. У падтрымку гэтага патрабавання сабрана каля 1.000 подпісаў рабочых прадпрыемства, аднак, як ужо паведамлялася, Віктар Емяльянаў —генеральны дырэктар ВА «Інтэграл», у склад якога ўваходзіць «Цветатрон», — прадаставіў М.Урбану выпрабавальны тэрмін у паўгода для навядзення парадку на заводзе.

БелаПАН

Салдата будуць судзіць

Як мінімум адзін з двух салдатаў, якіх у ноч з 27 на 28 ліпеня злачынцы «пазбавілі» зброі, апынецца на лаўцы падсудных.

Нагадаем, у ноч з нядзелі на панядзелак двое невядомых учынілі напад на вартавых адной з воінскіх часцей Гомельскай вобласці. «Канфіскаваўшы» ў салдатаў два аўтаматы Калашнікава і 60 патронаў, злачынцы зніклі.

Спецыяльнай камісіі, якая працавала на месцы здарэння, удалося высветліць сапраўдныя абставіны. Аказваецца, вартавыя, замест таго, каб шляхам патрулявання па перыметры несці службу, мірна спалі, забраўшыся на адну з вышак. Прачнуліся салдаты толькі тады, калі пачулі, што нехта адчыніў дзверы на вышку. Злачынцы не марнавалі час, — пачалі збіваць хлопцаў. Калі адзін з іх паспрабаваў абараняцца, ударылі яго нажом і, захапіўшы зброю, скрыліся на машыне, якая чакала на шашы. Следства адвяргае змову вартаўнікоў са злачынцамі, спасылаючыся на моцныя пабоі, якім яны падвергліся падчас нападу.

Такім чынам, адзін з вартаўнікоў будзе прыцягнуты да крымінальнай адказнасці за тое, што пакінуў свой пост.

Аляксандр ШКУЦЬКО

Наркаманы збіраюць «ураджай»

Як паведаміла прэс-служба Гомельскай абласной міліцыі, за сем месяцаў у Гомельскай вобласці ўзбуджаны 442 крымінальныя справы, звязаныя з ужываннем, набыццём, збытам і захаваннем наркатычных сродкаў.

Наркаманамі ўчынена 409 злачынстваў. Міліцыя сканфіскавала 209 кілаграмаў макавай саломкі, 3 кг марыхуаны і 16,5 літра экстракцыйнага опіуму (гэта некалькі тысяч доз). Рэкорд жніўня паставілі супрацоўнікі Рэчыцкай міліцыі, якія ў вёсцы Прокісель затрымалі аўтамабіль «Фольксваген» з трыма жыхарамі Светлагорска. У багажніку машыны аказалася 25 кг макусырцу.

Уладзімір ВАЛЕЎСКІ

Лукамольцам спадабалася быць кантралёрамі

Вельмі спадабалася магілёўскім актывістам Беларускага патрыятычнага саюза моладзі ўведзеная прэзідэнтам практыка ўключаць прадстаўнікоў БПСМ у склад прыёмных камісій ВНУ.

Гарадская арганізацыя лукамольцаў прапанавала, каб на наступны год іхнія прадстаўнікі прымалі іспыты таксама ў школах і вучылішчах. На думку «патрыётаў», у школах *«не заўсёды аб'ектыўна ацэньваюцца выпускнікі»*. Лукамольцы лічаць, што настаўнікі часта завышаюць адзнакі.

Сымон ГЛАЗШТЭЙН

Плаціць за кватэру не хочуць, бо не могуць

Больш за 20 мільярдаў рублёў завінаваціліся жыхары Бабруйска і Магілёва за камунальныя паслугі адпаведным службам гэтых гарадоў.

Камунальнікі паспрабавалі былі вырашыць праблему праз суд, каб спаганяць грошы цэнтралізавана праз бухгалтэрыі прадпрыемстваў. Але гэтыя прадпрыемствы самі не маюць грошай на рахунках, і ўзяць з іх няма чаго. Натуральна, што на жыхароў не дзейнічаюць і спробы маральнага ўплыву. Перад камунальнікамі ўлады паставілі задачу да лістапада знізіць запазычанасць хоць бы на 30%. Але не патлумачылі, як гэта зрабіць.

Сымон ГЛАЗШТЭЙН

БИТВА-97

Родина помнит о своих героях

Но забывает о своих деньгах

Государство выделило 4,6 млрд. рублей на расходы по приобретению наград для победителей объявленного соревнования по уборке урожая. Это примерно 150 тысяч долларов.

Родина не забывает своих героев. Постановлением Совета министров было решено награждать победителей «битвы за урожай» традиционными призами. Старшие комбайнеры могут получить за первое место легковой автомобиль (выделяется по 2 легковых автомобиля на область), за второе место — холодильник (по 4 на область). За третье можно будет посмотреть свои успехи по телевизору (по 6 телевизоров на область).

Простые комбайнеры и водители обойдутся мотоциклами и телевизорами. Руководители колхозов, совхозов, занявших первые места, а также руководители райисполкомов получат легковые автомобили для служебного пользования. Учреждены также дипломы с денежными премиями до 250 млн. рублей.

Но настолько ли эффективен процесс социалистического по духу соревнования, чтобы тратить на это большие деньги? Кроме того, в уборке ведь участвуют не только комбайнеры, водители, и уж тем более не только руководители колхозов, совхозов и райисполкомов. Существует еще множество обделенных вниманием профессий, роль которых не столь заметна, но весьма значительна.

«Битва за урожай» очень уж дорого обходится государству. Не говоря о посевной, только на уборку было израсходовано порядка 3 трлн. рублей банковских кредитов, плюс довольно большое количество бюджетных денег. Ради аграриев пришлось даже опустошить государственные запасы и резервы. Их пополнение потребует теперь еще 3 трлн. бюджетных денег. Причем и банкиры, и чиновники вероятность возврата денег, выделенных колхозам, оценивают как весьма низкую. Может, пусть лучше собственники земли и урожая тратят на его уборку, соревнования и прочее свои собственные деньги, а не средства, собранные со всего населения с помощью налогов.

Алесь САДОВСКИЙ

Дадут ли премию этим бабулям, которые работают на зернотоку в д. Ласица Пинского района?

ЧТО ДЕЛАТЬ

Оружие для каждого

За последние годы количество желающих купить оружие постоянно увеличивается. Во всяком случае, недавно, с удивлением для себя, обнаружил, что большинство моих знакомых вдруг стали вооруженными.

В Беларуси простому гражданину официально разрешено приобретать, хранить и носить только газовое оружие, которое является так называемым «специальным средством самообороны». Кроме газовых пистолетов и револьверов, в число таких спецсредств входят газовые баллончики.

Для получения разрешения на газовое оружие многого не требуется. Оформляется это разрешение в РОВД по месту жительства, для чего туда необходимо предоставить ряд документов.

Не для всех

Чтобы получить разрешение, необходимо выполнить ряд требований. Так, если газовый баллончик приобрести может любой желающий при условии, что ему исполнилось 16 лет, то право иметь и использовать газовые пистолеты и револьверы имеют лица, постоянно проживающие в РБ (имеющие постоянную прописку) и достигшие 18-летнего возраста.

Практически невозможно получить разрешение тем, кто состоял на учете по поводу психических заболеваний, алкоголизма и наркомании. Запрещена выдача разрешений лицам, которые совершили повторно в течение года административное правонарушение, *«посягающим на общественный порядок, злоупотребляющим спиртными напитками или употребляющими в немедицинских целях наркотические средства и другие одурманивающие вещества»*. И уж тем более легальное владение газовым оружием не светит *«имеющим непогашенную или не снятую в установленном порядке судимость за тяжкие преступления, а также за преступления, совершенные с применением огнестрельного оружия и взрывчатых веществ»* и *«осужденным к лишению свободы, условно осужденным и условно освобожденным из мест лишения свободы с обязательным привлечением к труду»*. Некоторые изобретатели и рационализаторы также могут вызвать недовольство органов — разрешение не выдается лицам, самостоятельно изменившим конструкцию газового пистолета (револьвера).

Сбор справок и написание заявлений

Вначале необходимо написать заявление на имя начальника РОВД по месту жительства, где изложить свое горячее желание получить разрешение на приобретение, хранение и ношение оружия, обычно — «в целях самообороны». К заявлению должны быть приложены еще пара фотографий (3 на 4 см) и две справки — о прохождении специальных курсов подготовки по владению газовым оружием и справка из поликлиники о состоянии здоровья с заключением о том, что медицинских противопоказаний к приобретению газового оружия нет.

Для получения медицинского заключения потребуется получить справку о том, что вы не состоите на учете в психоневрологическом диспансере либо заключение врачебно-консультационной комиссии этого диспансера. Аналогичная справка либо заключение потребуется из наркологического диспансера. Кроме этого, потребуется получить заключения невропатолога, терапевта, хирурга, отоларинголога, окулиста, которые также должны определить либо подтвердить отсутствие у вас множества разнообразных болезней, вроде шизофрении, хронического алкоголизма, наркомании, токсикомании, низкой остроты зрения, глухоты и т.п. Если всё с этим в порядке, то медицинское заключение почти в кармане.

Курсы по владению оружием не отнимут много времени и денег. В Ассоциации «Население за безопасность» это удовольствие стоит 250 тысяч рублей и занимает полтора часа, после чего вы получаете необходимую вам вторую справку.

В течение месяца заявление должно быть рассмотрено. В случае положительного решения будет выдано разрешение на приобретение газового оружия, которое действительно только на территории Беларуси в течение 3 месяцев.

Приобретение

Цены на более-менее нормальные пистолеты в минских магазинах начинаются примерно со 150 долларов и выше. Количество газового оружия, которое можно приобрести и пользоваться, не ограничивается. Продавать газовое оружие разрешено только специализированным предприятиям торговли Военно-охотничьего общества министерства обороны и Белорусского общества охотников и рыболовов. Выбор пистолетов и револьверов в подобных магазинах не слишком велик, и удовлетворить запросы придирчивых минских покупателей они вряд ли в состоянии. Тем не менее, стоит учесть, что регистрацию газовых пистолетов и револьверов зарубежного производства можно, согласно нормативным документам МВД, производить независимо от источника приобретения, даже если они без номеров. В последнем случае для регистрации необходимо нанести каким-либо способом номер на оружие.

Приобретенное газовое оружие необходимо зарегистрировать в течение 10 дней, а при ввозе его из-за рубежа — в течение 10 рабочих дней после въезда. Регистрация обычно стоит 0,5 минимальной заработной платы.

На зарегистрированное оружие выдается удостоверение, которое действительно в течение 3 лет и в общем-то и является тем самым *«разрешением на хранение, ношение, использование с целью самообороны газового пистолета (револьвера) и приобретение патронов к нему»*.

Однако этот процесс может продлиться весьма долго, и поэтому регистрацию приобретенного газового оружия можно проходить ускоренно (естественно, за дополнительную плату). Так, например, в Советском РОВД г. Минска это будет стоить в случае до 3 дней — 3 МЗП, до 10 дней — 2 МЗП, до 15 дней — 1 МЗП. Правда, весьма интересно, что эта оплата идет не на какой-либо бюджетный счет, а в некий общественный благотворительный фонд содействия правоохранительным органам «Правопорядок». Хотя в определяющем этот порядок документе райисполкома предусмотрено, что средства пойдут на развитие материально-технической базы РОВД и поощрение сотрудников.

Использование и наказание

В применении газового оружия есть несколько особенностей. Согласно документам МВД, владелец пистолета или револьвера перед этим обязан предупредить о намерении применить газовое оружие. Без предупреждения оружие можно применять только при внезапном нападении или при нападении с использованием оружия или *«других средств, используемых для нанесения телесных повреждений»*.

Причем о каждом случае применения необходимо сообщать в органы внутренних дел, а если есть пострадавшие — оказать им первую помощь и обеспечить оказание медицинской помощи.

По большому счету, газовое оружие и оружием-то не считается. Поэтому получить за его ношение, хранение, приобретение, изготовление или сбыт по полной программе, как предусмотрено для огнестрельного оружия — от 5 до 7 лет, маловероятно. Однако и до этого можно дойти, если увлечься популярными переделками оружия в пулевое (обычно для этого подходят некоторые модели российского производства).

Уголовным кодексом карается только незаконное изготовление или сбыт газового оружия, за что можно получить срок от 3 до 5 лет или исправительные работы на срок до 2 лет со штрафом. Остальные нарушения уголовным кодексом не регулируются.

Ян ГАЛЕВИЧ

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Метастазы шовинизма

Встречаясь довольно часто с моим близким товарищем, белорусом от дедов-прадедов по графе пятой в паспорте, я спорю с ним о Беларуси и белорусах и часто слышу: «Ну, что дает нам язык? Не лучше ли просто достойно жить?» Язык — это основа культуры народа, его душа, его песня. Отбросим все то, о чем я сказал, и что же остается: сытная похлебка, добротные ботинки, одежда, ну, может быть, машина... А душа?

Откажись от языка своего — и на смену ему тотчас же придет чужой, что и произошло уже с белорусами под жестким давлением соседей: сначала Польша пыталась выдавить белорусский язык, государственный язык ВКЛ, затем Россия. Не удалось! Остались еще белорусы. Не те, кто пишется в пятой графе, а белорусы в душе, в сердце сохранившие свою историю, свой язык, свою память о матери-Беларуси, как бы и когда она ни называлась. И не дело наше, людей, пришлых в Беларусь, указывать народу, какой язык выбирать. Да и выбора никакого быть не может: здесь есть язык белорусского народа, и наше дело, наша обязанность, как людей пришлых, знать его. Мы знать его досконально уже не будем, но детей учить мы обязаны.

Что же пугает многих? Тот труд, который придется затратить, чтобы выучить язык белорусов? Возможно! А может, всё дело в метастазах великодержавного сознания, пронизавших нас? Показывают по ТВ людей, уехавших из Эстонии в Псковскую область: «Ах, у нас там все было, а в России надо начинать с нуля! Но жить там было невозможно: заставляли учить эстонский язык».

— А сколько же вы там прожили?

— Двадцать пять лет. Там поженились, детей родили.

— И что же — за 25 лет не выучили языка?

— Нет! А зачем? Пусть эстонцы учат наш — «общепонятный!»

Это взгляд оккупанта!

От другого «белоруса» услыхал еще один «перл»: «На что мне этот белорусский язык — что мне, в магазине хлеба не дадут?» (Имелось в виду — если он его знать не будет.) Наверное, такая муть специально вбивается в головы людям, чтобы вызвать стойкую аллергию на язык белорусов. Чушь полная! Говори на каком хочешь языке. Хлеба в магазине можешь попросить хоть на пальцах, но государственным языком должен быть только белорусский. И знать его должен каждый. И никакого интернационализма в введении русского языка я не вижу.

Пишу это я, между прочим, и Вам, господин Павел Владыка, автор письма «И нас — большинство», опубликованного в СВАБОДЗЕ № 63. Человек вы нормальный, судя по письму, но подобных сентенций о языке я наслушался — с души воротит. Вы пишете: *«...поскольку родители у меня с Украины»*, — но я думаю, что и украинского вы не знаете. Жили в стороне от Украины, и не нужна вам, похоже, ни Украина, ни Беларусь, а нужно просто некое пространство, где бы вы могли построить нормальную жизнь — «достойную».

Нет национальной идеи без национального языка! Это раз. Второе: *«Примеров, где граждане говорят на одном языке, но являются подданными различных стран — множество»*. Так точно! Арабы разошлись на разные государства, но у них изначально был тот самый язык и никакой другой. Сербы, хорваты, босняки говорят практически на одном языке, но у них другого никогда не было. А у нас предлагают подмену коренного языка на принесенный извне. Увольте! Да это оскорбление!

Я, как и Вы, Павел, украинец. И тоже потому, что родители у меня с Украины. А я родился на Дальнем Востоке, но один раз в детстве побывав на Украине, я полюбил этот край, его историю, язык и народ. И украинец я не только потому, что родители... Я — украинец. И чувствуя боль моей родной неньки-Украины, и прежнюю, и нынешнюю, я чувствую боль и Беларуси. И попадая на Украину, я, когда говорю с людьми незнакомыми, стараюсь говорить по-украински.

Думаю, что без языка мы будем лишь патриотами «белорусского сала», а не Беларуси.

В.ПОНОМАРЕНКО,
46 лет, г.Минск

Из чего мы сделаны

Не так давно я прочитал одну статью в научно-популярном журнале и сейчас о ней вспомнил. Так вот, в ней, этой самой статье, приводилась интересная мысль: «Человек есть то, что он ест». Эту умную мысль как-то произнес один древнегреческий мыслитель. А дальше в этой статье сообщалось о том, что любили есть разные знаменитые личности. И это весьма любопытно.

Федор Достоевский, когда у него случалось хорошее настроение, любил отведать сыра, орехов, апельсинов, рыжиков, икры — и всё это сдабривалось хорошей порцией французской горчицы и запивалось вином в большом количестве. При плохом настроении Федор Михайлович предпочитал ограничиться чашкой бульона и телячьими котлетами. Без вина, правда, и при плохом настроении не обходилось.

Лев Толстой, как известно, не ел ни рыбы ни мяса, или, говоря по-простому, был вегетарианцем. На завтрак Лев Николаевич вкушал макароны, овощи и фрукты. На обед — холодный свекольник или постные щи. На ужин — коврига хлеба с толстым слоем гречишного меда и миска овсяного киселя. Но больше всего на свете классик любил огурцы. Притом не какие-то там малосольные или маринованные, а самые что ни на есть натуральные, только что с грядки. Вставал великий писатель рано поутру, одевал рубаху-толстовку, напяливал холщевые домотканые штаны, подпоясывался уздечкой от конской сбруи, брал в руки огромное решето и босиком выходил на огуречные грядки. Затем с полным решетом огурцов приходил к себе в усадьбу, садился за письменный стол и сочинял свои знаменитые произведения. Напишет пару слов — хрусть огурцом, еще несколько напишет — хрусть-хрусть. К примеру: «Все смешалось... — хрусть — ...в доме Облонских» — хрусть-хрусть. Напишет главу — решето пустое.

А вот Афанасий Фет вегетарианством не страдал. Любил старик и щи, как Толстой, но только не постные, а, понимаете ли, хорошие. Так и писал: «Дайте мне хороших щей и горшок гречневой каши. Дайте мне кусок мяса, и больше мне ничего не надо».

А дальше из этой самой статьи я узнал, что Пушкин любил сладости и моченую морошку, Стендаль — яичницу, а Петр Первый — артишоки. А вот Эрнст Теодор Амадей Гофман писал свои страшные сказки, привязав к носу кусок ржаного хлеба с тмином, дабы постоянно ощущать хлебный аромат. Неизвестно только, съедал ли он его после или жертвовал своему верному слуге Зильберу. От себя замечу, что Гофман писал свои произведения в изрядном подпитии, а по-трезвому у него ничего путного не получалось. И чем больше Теодор Амадей пьянел, тем сильнее у него разыгрывалось воображение и тем ужаснее становилась сказка. Во всяком случае, могу ручаться, что спиртным он с Зильбером не делился.

Статья, безусловно, была интересной и познавательной, но автор все же не о всем рассказал, не обо всех замечательных личностях поведал. Я вот еще знаю, что Альфред де Мюссе любил фрикассе и монпансье, Жорж Санд обожала сандвичи с ветчиной, а художник Поль Сезанн объедался жареными сазанами. А вот Н.В.Гоголь почему-то не признавал гоголь-моголь (кстати, изобретенный нашим земляком, могилевским кантором Гогелем), а предпочитал хлебный квас да малороссийские галушки со сметаной.

Еще я знаю, что немецкий философ Фридрих Ницше терпеть не мог немецкую кухню. Любил итальянскую, французскую, испанскую и даже, представьте себе, турецкую, а вот немецкую терпеть не мог. А его соотечественник и тоже философ Иммануил Кант, тот не брезговал покушать и по-немецки. Бывалыча откушает немецких свиных колбасок с кислой капустой, запьет баварским пивком да и сочинит что-нибудь эдакое заковыристое, философский трактат например. И получалось у него не хуже, чем у Ницше. Древний же, представьте себе, тоже философ Диоген такими проблемами не мучился, дурью не маялся, кухню не выбирал, а только валялся себе в деревянной бочке и питался тем, что приносили ему благодарные ученики, как-то: виноград, финики, козий сыр и вяленое мясо. Но это халявство ему прощали, так как он, в отличие от Ницше, ничего не писал, а только высказывал различные мысли, которые благодарные соотечественники-афиняне, не такие умные, как Диоген, быстренько запоминали. Может, и вышеприведенная цитата тоже его? Кто знает.

Русский художник Алексей Саврасов вообще почти ничего не ел, а только пил водку да закусывал исключительно ягодой клюквой, и тем не менее написал замечательную картину «Грачи прилетели». Живший в одно время с Саврасовым писатель Боборыкин водку почти не пил (благодаря чему и оставил нам в наследство кучу малоизвестных нынче романов), но вот покушать обожал. Любил маститый прозаик и суточные щи, и кулебяку, и гурьевскую кашу, и салат «оливье», и расстегаи с визигой. Не знаю, что такое «визига», но были еще расстегаи на четыре угла. В один угол закладывались, например, молодые шампиньоны, в другой — налимья печенка, в третий — щеки осетра, в четвертый — еще какой-нибудь деликатес. Так вот, такие квадратные расстегаи Боборыкину тоже очень нравились. Затем запивал он все это бутылкой-другой кислых щей (такой шипучий напиток) и писал очередной роман, может быть даже «Китай-город»... Эх, и хорошо же мне пишется на голодный желудок!

Так вот, если верить древнегреческому умнику, что человек есть то, что он ест, то, проанализировав вышеизложенные факты, мы узнаем, что Федор Достоевский в зависимости от настроения состоял из сыра, апельсинов и телячьих котлет. Стендаль из яичницы. Пушкин из моченой морошки. Гоголь — это не что иное, как хлебный квас с украинскими галушками, а Петр Первый — так это вообще сплошные артишоки. Что уж говорить о руском художнике Саврасове? Здесь мы имеем только водку с кислющей клюквой. А вот теперь подумайте, из чего состоим мы с вами?

Не могу знать, из чего теперь состоит наш уважаемый президент с его не менее уважаемым президентским окружением. Могу только догадываться, из чего сделаны прочие «новые белорусы». Но я, например, как рядовой гражданин нашей страны, при моем нищем бюджете — почти один хлеб да картошка, и из всех перечисленных выше знаменитостей мне даже и сравниться не с кем. А может быть, все же есть какое-то сходство? Точно знаю, что с Достоевским мы по составу абсолютные антиподы, не говоря уже о Боборыкине. С царственным Петром?.. Артишоки я и в глаза не видел. С Гофманом? Так ведь тот хлеб только нюхал. С Саврасовым? Очень может быть, только в наших местах клюква не водится. А потом вспомнил — Толстой! Все же постные щи да пару огурцов в сезон я могу себе позволить, и потому хоть чуточку, да схож по химическому составу со Львом Николаевичем.

И это хоть чуточку, но утешает.

Михаил ЦЫМАНОВ,
г.Волковыск

УПРАВЛЕНИЕ КАПИТАЛОМ

Информационно-аналитический белорусский журнал

Обзор экономических событий, информация, новости, анализ и комментарии, практические советы.

Редакция:
220015 г.Минск, ул. Пономаренко, 7-37
E-mail: itcinfo@valeha.minsk.by
тел./факс:
Минск (017) 210-23-16, 210-23-17
пейдж. 249-00-00, аб. 1263
Жодино (275) 2-26-24
Бобруйск (02251) 7-45-55, 2-13-19
Витебск (0212) 37-76-82, 36-91-61

Редакция приглашает к сотрудничеству заинтересованных лиц для организации представительских пунктов в областных и районных городах.

ИЗ АВГУСТОВСКОГО НОМЕРА ВЫ УЗНАЕТЕ:

- от кандидата экономических наук Безмена А. о **проблемах Белорусского бюджета;**
- от руководителя Центра оценки и развития персонала Ольвинской Ю. **о том, как управлять людьми;**
- от президента «Investment Technologies Centre» Повидайко В. **об амортизационной политике предприятия и о том, как управлять капиталом и инвестициями;**
- от заместителя директора Института статистики Мироненко В. **Об некоторых экономических итогах первого полугодия 1997 года;**
- от начальника отдела финансов Министерства экономики Аносова В. **о проблемных вопросах целевого использования источников воспроизводства основных фондов в Республике Беларусь;**
- от экономиста Зайцева А. **о путях и проблемах реформирования убыточного аграрного сектора Республики Беларусь;**
- от экономиста Карелина Д. **о лизинговых операциях. как формы обновления основных фондов;**
- а также **о ситуации на валютном и фондовом рынках ;**
- о том, что **подписку можно оформить в почтовых отделениях, подписной индекс**

74999

Стеллажи и стойки

– ТОРГОВЫЕ –
– ЭКСПОЗИЦИОННЫЕ –
– ОФИСНЫЕ –

ДЛЯ ГАЗЕТ И ЖУРНАЛОВ,
– ДЛЯ ПАПОК И БУМАГ

ПРОДАЖА ГОТОВЫХ ИЗДЕЛИЙ И ИЗГОТОВЛЕНИЕ ПО ИНДИВИДУАЛЬНЫМ ЗАКАЗАМ



Тел. (017) 210-02-53,
факс 236-24-41

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Чарнобыльскі хлопчык у амерыканскай сям'і

Сёлета многім беларускім дзецям, якія пацярпелі ад чарнобыльскай аварыі, зноў удалося трапіць на летні адпачынак за мяжу. Пра іх часам піша там мясцовая прэса. А вось публікацыі ў такой буйной амерыканскай газеце, як «Boston Globe», — з'ява нячастая.

Карэспандэнтка Глорыя Нэгры напісала пра Алёшу Сапончыкава, якога яна называе поўным імем — Аляксей Анатольевіч і зазначае, што ў Беларусі імёны *«такія доўгія, як расійскія зімы»*. Але, маўляў, такое вялікае імя мае маленькі хлопчык, якому 13 гадоў, але выглядае ён усяго на 5.

Аляксей — адна з 84 ахвяраў Чарнобыля, якія прыбылі ў Амерыку для медычнага абследавання, адпачынку і аднаўлення сілаў. Дзеці прыязджалі на месяц, але Аляксея пакінулі на больш тэрмін з-за таго, што ў яго знайшлі некалькі сур'ёзных захворванняў.

Апякуюцца хлопчыкам доктар дзіцячага шпіталю Джэйн Шэлер і святар Роберт Боўэрс з касцёла Святой Агаты ў Іст-Мілтане. Карэспандэнтка зазначае, што гэта — адна з пяці каталіцкіх парафій, якія вось ужо чатыры гады арганізуюць прыезд у Амерыку беларускіх дзяцей паводле чарнобыльскага праекта.

Доктар і святар пачалі клапатаць пра тое, каб час знаходжання Алёшы Сапончыкава ў Штатах павялічылі да васьмі месяцаў. Як зазначае аўтарка, беларускі ўрад і амерыканская іміграцыйная служба падтрымалі іх. Пры гэтым яна паведамляе чытачам, што *«Беларусь дамаглася незалежнасці ад былога Савецкага Саюза ў 1990 годзе»*.

Алёша жыве ў прыгарадзе Бостана — у Мілтане, у сям'і Джойсаў, у якіх ёсць тры свае сыны. Сёлета гэтая сям'я ўжо прымала аднаго беларускага хлопца — 13-гадовага Максіма, хворага на рак шчытападобнай залозы. Ён ужо вярнуўся дахаты.

У сям'і Джойсаў да Алёшы вельмі добра ставяцца. Калі ён прыехаў у Амерыку, дык важыў амаль на чвэрць менш, чым цяпер. Ён любіць шакаладнае малако і курыныя ножкі, піша Глорыя Нэгры. А 27-га жніўня Джойсы арганізуюць для яго ўпершыню дзень нараджэння. Яму добра ў амерыканскай сям'і. Аднойчы ў рэстаране караоке ён *«устаў і праспяваў рускую народную песню»*.

Да прыезду ў Амерыку ў Алёшы не было нават свайго ўласнага адзення. Калі яму было 11 месяцаў, маці пакінула яго на вуліцы і ад таго часу ён жыве ў дзіцячым прытулку. Але калі яна даведалася, што ён паедзе ў Амерыку, дык прыйшла і прынесла яму ежы і напой, але ён адмовіўся ад яе падарункаў. Маці, дарэчы, папрасіла, каб ён прывёз ёй з Амерыкі адзенне...

Карэспандэнтка зазначае, што Алёша завалодаў сэрцамі Джойсаў і яны вельмі ўпадабалі яго. Першае, што ён купіў там, гэта былі падарункі для Джанэт, гаспадыні. Ён называе яе «мамай» і просіць, каб яна была яго маці назаўсёды.

Сяргей МАКСІМОВІЧ

Дзякуй Богу і брытанцам

Жыхары англійскага горада Чэстэр выратавалі жыццё бабруйскаму хлопчыку Андрэю Асіпенку, які быў хворы на цэрэбральны параліч.

Чулліввыя брытанцы сабралі для хворага 20 тысяч долараў, што дало магчымасць правесці аперацыю. Як сведчаць урачы, аперацыя прайшла паспяхова і Андрэй мае ўсе шансы на выздараўленне. Дай Бог!

Іван ЗАСАДА

ДАГЕРОТИП

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 23.25 Новости. 8.15 «Девушка по имени Судьба». 9.00 «Мы». 9.55 Смехопанорама. 10.25 Домашняя библиотека. 10.30 «Угадай мелодию». 14.20 «Погонщики динозавров». 14.45 Кварьете «Веселая квампания». 14.55 Мультитроллия. 15.15 Волшебный мир, или Синема. 15.40 «Гарри — снежный человек». 16.05...До шестнадцати и старше. 16.30 Вокруг света. 17.15 «Девушка по имени Судьба». 18.05 Погода. 18.10 Час пик. 18.35 «Угадай мелодию». 19.00 Тема. 19.40 Спокойной ночи, малыши! 20.00 Время. 20.45 Х/ф «Судьба Марины». 22.35 Х/ф «Человек по имени Алекс».

Канал «Россия»

7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести. 7.25 Лукоморье. 7.50 Посмотри на себя. 8.00 Православный календарь. 8.05 Мультфильмы. 8.35 Караоке по-русски. 9.10 «Санта-Барбара». Х/ф. 14.45 Образ жизни. 15.10 Телемагазин «Квантум». 15.20 «Ти-маркет» представляет. 15.30 «И это кино». 16.20 Там-там новости. 16.30 Лукоморье. 16.55 Посмотри на себя. 17.05 Новое «Пятое колесо». 17.40, 0.25 Товары — почтой. 17.45 Представляет «Проект-арсенал». 18.00 «Санта-Барбара». Х/ф. 19.35 Добрый вечер. 20.10 «Облако-рай». Х/ф. 21.30 Момент истины. 22.35 Нобелевские лауреаты. 23.15 Мастер-ралли-97. 23.30 Звуковая дорожка. 0.35 «Абсолютная власть». Х/ф.

Санкт-Петербург

12.30, 15.30, 18.30, 20.25 Информ ТВ. 12.45 «История любви». 13.35 Срок ответа — сегодня. 14.05 Советы садоводам. 14.30 Легенда о певице. 14.55 Папа, мама, я — спортивная семья. 15.40, 22.20 Телеслужба безопасности. 15.55 «Собачье счастье». С. 2. 16.50 От и до... 17.05 Студия «Вообрази». 17.25 Телемагазин. 18.45 Спорт. 18.55 Мультфильм. 19.10 «История любви». 20.00 Телестанция «Моя Россия». 20.30 VI Всемирная ярмарка «Российский фермер». Дневник. 20.40 Поэзия Марины Цветаевой. 20.45 Музыка из Петербурга. 21.30 «Собачье счастье». С. 2.

НТВ

5.00 Сегодня утром. 8.15 «Гангстерские хроники: американская история». 9.15 «Пойми меня». 9.45 Новости кино. 10.00 «Иллюзии любви». 11.00, 13.00, 15.00 Сегодня днем. 11.20 Дог-шоу. 11.50 Мультфильм «Алиса в Стране чудес». 12.00 «Стремление к небесам: история авиации». «Вертикальный полет». 13.20 Х/ф «Магазинчик ужасов». 15.10 «Голубое дерево». Х/ф. 16.00 Дистанция 60. 17.00 Криминал. 17.05 Я — телохранитель. 17.15 Впрок. 17.30 «Улица Сезам». 18.00, 21.00 Сегодня вечером. 18.40 Х/ф «Алиса здесь больше не живет». 20.40 «Алло, Фима!» 21.45 «Привидения». «Я буду за тобой следить». 22.40 Времечко. 23.10 Открытое первенство США по теннису. 0.10 Х/ф «Каспар Хаузер». Ч. 1.

8 канал

18.00 Программа Кеннета Копланда. 18.30 Х/ф «Эдди». 20.15 Мульт-планета. 20.30 Сериал «Горец-4». 21.30 Служба оперативной информации. 22.00 Х/ф «Игрок».

СЕРАДА 27 жніўня

БТ

7.30 Утренний коктейль. 7.45, 19.05 «Музыкальная обойма». 7.50 «Встреча, определившая судьбу». Д/ф. 8.00, 13.00, 15.00, 18.00, 23.40 Новости. 8.10 «Ход слоном». Х/ф. 8.20 Око. 8.40 Турообъектив. 9.00 Мультиклуб. 9.30, 17.45 Экономикст. 9.40 Бездельник. 10.10 Компьютерный полигон. 10.30 Музыкальный салон Элеоноры Езерской. 11.15 «Кадфаэль». 11.55 Видимо-невидимо. 15.15 Мультфильм. 15.30 Телебом-клип. 15.55 «Ученики-учителя». 16.30 Гости в дом. 17.00 Музыкальный антракт. 17.10 «Сын Отечества». Д/ф. 18.20 «Кадфаэль». 19.15 Тема дня. 19.35 Темная комната. 20.00 Ток-шоу «Это моя работа». 20.25 Автопарк. 20.40 Колыбельная. 21.00 Панорама. 21.45 «Центр» с миссией здоровья по всему миру». 21.50 Х/ф «Не будите спящую собаку». С. 1. 23.00 Королевская охота. 23.50 Футбол. Кубок чемпионов. МПКЦ — «Олимпиакос» (Греция). Т. 2.

ОРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 23.10 Новости. 8.15 «Девушка по имени Судьба». 9.00 Тема. 9.45 В мире животных. 10.20 Домашняя библиотека. 10.30 «Угадай мелодию». 14.20 «Погонщики динозавров». 14.45 Кактус и К. 14.55 До-ми-соль. 15.15 Зов джунглей. 15.40 «Гарри — снежный человек». 16.05...До шестнадцати и старше. 16.30 Вокруг света. 17.15 «Девушка по имени Судьба». 18.05 Погода. 18.10 Час пик. 18.35 «Угадай мелодию». 19.00 «Чтобы помнили...» 19.40 Спокойной ночи, малыши! 20.00 Время. 20.45 Х/ф «Разведчики». 22.15 Поет Лайма Вайкуле.

Канал «Россия»

7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести. 7.25 Лукоморье. 7.45 Посмотри на себя. 7.55 Мультфильм. 8.00 Православный календарь. 8.05 Мультфильмы. 8.35 L-клуб. 9.10 «Санта-Барбара». Х/ф. 14.45 Парламентарий. 15.10 Телемагазин «Квантум». 15.20 «Ти-маркет» представляет. 15.25 Мультфильмы. 15.30 «И это кино». 16.20 Там-там новости. 16.35 Лукоморье. 16.55 Посмотри на себя. 17.05 «Лешкин луг». Д/ф. Ч. 4. 17.40, 0.10 Товары — почтой. 17.45 Представляет «Проект-арсенал». 18.00 «Санта-Барбара». Х/ф. 19.35 Добрый вечер. 20.20 «Пейзаж с тремя купальщицами». Х/ф. 22.35 Нобелевские лауреаты. 23.15 Мастер-ралли-97. 23.30 Кафе «Обломов». 0.20 «Разыскивается опасный преступник». Х/ф.

Санкт-Петербург

12.30, 15.30, 18.30, 20.25 Информ ТВ. 12.45 «История любви». 13.35 Срок ответа — сегодня. 14.05 Советы садоводам. 14.25 Хуторок. 14.55 Звездный розыгрыш. 15.40, 22.20 Телеслужба безопасности. 15.55 «Победить Аляску». Х/ф. С. 1. 16.50 Ржавые провода. 17.25 Телемагазин. 18.45 Спорт. 18.55 Мультфильмы. 19.10 «История любви». 20.00 Телестанция «Моя Россия». 20.30 VI Всемирная ярмарка «Российский фермер». Дневник. 20.40 Поэзия Марины Цветаевой. 20.45 Сокровища Петербурга. 21.00 Парадоксы истории. 21.30 «Победить Аляску». Х/ф. С. 1.

НТВ

5.00 Сегодня утром. 8.15 «Гангстерские хроники: американская история». 9.15, 17.30 «Улица Сезам». 9.45 Новости кино. 10.00 «Иллюзии любви». 11.00, 13.00, 15.00 Сегодня днем. 11.20 Своя игра. 11.50 Мультфильм «Алиса в Зазеркалье». 12.00 «Стремление к небесам: история авиации». «Истребители». 13.20 Х/ф «И воры любят». 15.10 «Голубое дерево». Х/ф. 16.00 Дистанция 60. 17.00 Криминал. 17.05 Я — телохранитель. 17.15 Впрок. 18.00, 21.00 Сегодня вечером. 18.40 Доктор Угол. 19.00 Футбол. Лига чемпионов. 21.45 «Привидения». «Кровь и вода». 22.40 Времечко. 23.10 Открытое первенство США по теннису. 0.10 «Каспар Хаузер». Ч. 2.

8 канал

18.00 Программа Кеннета Копланда. 18.30 Х/ф «Танго на Дворцовой площади». 19.45 Аэробика «Новый Эдем». 20.15 Мульт-планета. 20.30 «Горец-4». 22.00 Х/ф «Смерть у нее перед глазами».

ЧАЦВЕР 28 жніўня

БТ

15.55 Педагогический экран. 16.35 «Так это было...» 16.55 Футбол. Кубок кубков. «Белшина» — «Садам» (Эстония). 18.30 Новости. 19.05 «Музыкальная обойма». 19.15 Тема дня. 19.35 Сделано в Беларуси. 19.50 АРТ-клуб. М.Горецкий. «Драматические образки». 20.30 Музыкальный антракт. 20.40 Колыбельная. 21.00 Панорама. 21.50 Телебарометр. 22.05 «Не будите спящую собаку». С. 2. 23.15 Крок. 23.55 Новости.

ОРТ

15.15 Лего-го! 15.40 «Гарри — снежный человек». 16.05...До шестнадцати и старше. 16.30 Вокруг света. 17.00 Новости. 17.15 «Девушка по имени Судьба». 18.05 Погода. 18.10 Час пик. 18.30 Джентльмен-шоу. 19.00 Моя семья: квартирный вопрос. 19.40 Спокойной ночи, малыши! 20.00 Время. 20.45 Х/ф «Соммерсби». 22.45 Магия: мир сверхъестественного. 23.15 Новости.

Канал «Россия»

16.00, 19.00, 22.00 Вести. 16.20 Там-там новости. 16.30 Лукоморье. 16.55 Посмотри на себя. 17.05 Люди, деньги, жизнь... 17.40, 23.30 Товары — почтой. 17.45 Представляет «Проект-арсенал». 18.00 «Санта-Барбара». Х/ф. 19.35 Добрый вечер. 20.20 «Необыкновенная выставка». Х/ф. 22.35 Нобелевские лауреаты. 23.15 Мастер-ралли-97. 23.40 «...Цензуру к памяти не допускаю». Х/ф.

Санкт-Петербург

15.30, 18.30, 20.25 Информ ТВ. 15.40 «История любви». 16.35 «Победить Аляску». С. 2. 17.25 Телемагазин. 18.45 Спорт. 18.55 Мультфильм. 19.10 «История любви». 20.00 Телестанция «Моя Россия». 20.30 VI Всемирная ярмарка «Российский фермер». Дневник. 20.40 Поэзия Марины Цветаевой. 20.45 «Дом кино». 21.30 «Победить Аляску». Х/ф. С. 2. 22.20 Телеслужба безопасности.

НТВ

15.00 Сегодня днем. 15.10 Х/ф «Голубое дерево». 16.00 Дистанция 60. 17.00 Криминал. 17.05 Я — телохранитель. 17.15 Впрок. 17.30 «Улица Сезам». 18.00, 21.00 Сегодня вечером. 18.40 Х/ф «Возврата нет». 21.45 «Привидения». «Массаж». 22.40 Времечко. 23.10 Открытое первенство США по теннису. 0.10 Х/ф «Привет, мама!».

8 канал

18.00 Программа Кеннета Копланда. 18.30 Х/ф «Южный комфорт». 20.15 Мульт-планета. 20.30 «Горец-4». 21.30 Музыкальный конвейер. 22.00 Х/ф «Сорванец».

ПЯТНІЦА 29 жніўня

БТ

7.30 Утренний коктейль. 7.45, 19.05 «Музыкальная обойма». 7.50 «Зеркало воды». Д/ф. 8.00, 13.00, 15.00, 18.00, 23.35 Новости. 8.10 Телебарометр. 8.20 Авто-парк. 8.30 Родное слово. 8.50 Бархатный сезон. 9.30, 17.45 Экономикст. 9.40 Мультфильмы. 10.10 «Голоса прошлого». 10.35 «Уникум». 11.15 «Кадфаэль». 11.55 Творцы. 12.20 Королевская охота. 15.15 «Забор с голубым глазом». Х/ф. 15.25 «Светлана». Д/ф. 15.55 Концертный сезон. 16.30 Окружающий мир. 17.00 Музыкальный антракт. 17.10 «Судьба и время». 18.20 «Кадфаэль». 19.15 Тема дня. 19.35 Международный курьер. 20.00 «В джазе только девушки». 20.30 Летний день села. 20.40 Колыбельная. 21.00 Панорама. 21.50 Х/ф «Палач». 23.45 «Акколада». Ночной концерт. Группа «Стокс».

ОРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 22.25 Новости. 8.15 «Девушка по имени Судьба». 9.05 Моя семья: квартирный вопрос. 9.45 Пока все дома. 10.20 Домашняя библиотека. 10.25 Играй, гармонь любимая! 14.20 Мультфильм «Маугли». 15.55 «50 х 50». 16.30 Шахтерское лето-97. 17.15 «Девушка по имени Судьба». 18.10 Погода. 18.15 Человек и закон. 18.45 Поле чудес. 19.40 Спокойной ночи, малыши! 20.00 Время. 20.45 «Строго на юг». 21.45 Взгляд. 22.40 Х/ф «Найти и уничтожить». 0.15 Пресс-экспресс.

Канал «Россия»

7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести. 7.25 Лукоморье. 7.50 Посмотри на себя. 8.00 Православный календарь. 8.05 Мультфильмы. 8.35 «Аншлаг» представляет. 9.10 «Санта-Барбара». Х/ф. 14.45 Золотая карта России. 15.10 Телемагазин «Квантум». 15.20 «Ти-маркет» представляет. 15.30 «И это кино». 16.20 Там-там новости. 16.30 Лукоморье. 16.55 Посмотри на себя. 17.05 «Лешкин луг». 17.40, 23.30 Товары — почтой. 17.45 Представляет «Проект-арсенал». 18.00 «Санта-Барбара». Х/ф. 19.35 Добрый вечер. 20.20 «Гранатовый браслет». Х/ф. 22.35 Нобелевские лауреаты. 23.10 Мастер-ралли-97. 23.40 Х/ф «Что-то светлое». 1.15 Ночной экспресс.

Санкт-Петербург

11.55, 17.25 Телемагазин. 12.30, 15.30, 18.30, 20.25 Информ ТВ. 12.45 «История любви». 13.35 Срок ответа — сегодня. 14.05 Советы садоводам. 14.25 «Три колеса, фолиант и...» 15.00 Ток-шоу «Наобум». 15.40, 22.20 Телеслужба безопасности. 15.55 Закулисье. 16.40 Сказка за сказкой. 17.15 Мультфильм. 18.45 Спорт. 18.55 Мультфильм. 19.10 «История любви». 20.00 Телестанция «Моя Россия». 20.15 VI Всемирная ярмарка «Российский фермер». Дневник. 20.30 Игра «Лотто-бинго». 21.30 «Телекомпакт».

НТВ

5.00 Сегодня утром. 8.15 «Гангстерские хроники: американская история». 9.15 «Улица Сезам». 9.45 Новости кино. 10.00 «Моя последняя мечта будет о Вас». «Шарлотта, или Несчастная любовь». 11.00, 13.00, 15.00 Сегодня днем. 11.20 Русские гвозди. 11.50 Мультфильм «Алиса в Зазеркалье». 12.00 «Стремление к небесам: история авиации». «Победа на море». 13.20 Х/ф «Убить Джой». 15.10 Х/ф «Голубое дерево». 16.00 Дистанция 60. 17.00 Криминал. 17.05 Я — телохранитель. 17.15 Впрок. 17.30 Футбольный клуб. 18.00, 21.00 Сегодня вечером. 18.40 Х/ф «Волки». 20.40 Доктор Угол. 21.45 «Привидения». «Три мили вверх по реке». 22.40 Времечко. 23.10 Открытое первенство США по теннису. 0.10 Х/ф «Завещание голубого дядюшки».

8 канал

18.00 Программа Кеннета Копланда. 18.30 Х/ф «Исполнитель приговора». 19.45 Аэробика «Новый Эдем». 20.15 Мульт-планета. 20.30 Экстремальные игры. 21.30 Музпарад. 21.45 Х/ф «Золотой глаз».

СУБОТА 30 жніўня

БТ

8.00, 15.00 Новости. 8.15 Здоровье. 8.45 Международный курьер. 9.10 «Все дело в шляпе». 9.35 «Под углом 23,5 градуса». 10.00 Уроки Н.Новожиловой. 10.30 Регион. 11.00 Судьба моя и надежда. 11.30 Зеркало. 11.55 «Все нормально, мама!» 12.30 Мотоспорт. 13.00 «Музыкальная обойма». 13.15 Многоголосие. 13.45 Концертный сезон. 14.10 «Макаенка, 9». 14.30 Творцы. 15.20 Телеспорт. 16.05 «Все мы родом из детства». 17.00 «Риск-версия». 17.25 «Персияночка». 17.35 Белорусский дом. 18.10 Галерея. 18.45 «Цветы провинции». Х/ф. 20.15 История любви. 20.40 Колыбельная. 21.00 Панорама. 21.45 Теленавигатор. 22.05 Х/ф «Прощальные гастроли». 23.20 Третий тайм. 23.40 Видимо-невидимо.

ОРТ

7.00 Х/ф «Алые маки Иссык-Куля». 8.40 Лотто-Миллион. 8.45 Домашняя библиотека. 9.00 Новости. 9.10 Слово пастыря. 9.30 Утренняя почта. 10.05 Каламбур. 10.35 Смак. 10.55 Возвращение Третьяковки. 11.20 Х/ф «Ключ без права передачи». 13.00 Умники и умницы. 13.25 Очевидное-невероятное. 14.00 Новости. 14.20 «Союзмультфильм» представляет... 15.15 В мире животных. 15.55 Футбол. Чемпионат России. 16.45 Новости. 17.50 Клуб «Белый попугай». 18.40 Погода. 18.50 «Строго на юг». 19.40 Спокойной ночи, малыши! 20.00 Время. 20.55 Х/ф «Человек-амфибия». 22.50 Х/ф «Возвращение Мартина Герра».

Канал «Россия»

7.00 Утренний экспресс. 7.55 Товары — почтой. 8.05 Клуб «Адреналин». 8.20 «Мемориа». 8.45 Доброе утро, страна! 9.30 В мире животных. 10.00 Вести в одиннадцать. 10.15 Вестник потребителя. 10.40 «Хочу в артисты!» 11.20 Двойной портрет. 11.50 Караоке по-русски. 12.15 Анонимные собеседники. 12.45 Нефть и капитал. 13.00 Вести про... 13.20 «Арабелла возвращается, или Румбурак — король страны сказок». Х/ф. 14.25 Бесконечное путешествие. 14.50 Телескоп. 15.30 Чемпионат мира по вольной борьбе. 16.35 Мужчина и женщина. 17.55 «Аншлаг» и К. 19.00 Вести. 19.35 Сам себе режиссер. 20.10 «Четыре свадьбы и одни похороны». Х/ф. 22.15 Му-мухи творчества. 22.35 Момент истины. 23.30 Мастер-ралли-97. 23.45 Дорогами надежды. 24.00 Репортер. 0.15 Программа «А».

Санкт-Петербург

9.30, 12.30, 15.30, 18.30, 21.30 Информ ТВ. 9.45 Взлетная полоса. 10.15 «Честь имею». 10.45 «Индаба». 11.05 «Кондоры». 12.00 Ток-шоу «Наобум». 12.45 Страсти-мордасти. 13.05 Золотой фонд Петербургского телевидения. 14.35 Мультфильм. 14.50 Исторические расследования. 15.45 Спортивное обозрение. 16.05 Бит-квартет «Секрет». 16.55 Телестанция «Моя Россия». 17.25 Телемагазин. 19.00 «Несут меня кони». Х/ф. 20.45 Блеф-клуб. 21.45 VI Всемирная ярмарка «Российский фермер». Дневник. 21.55 «Парад парадов». 22.30 «Никотин». Х/ф.

НТВ

7.00 Сегодня утром. 7.15 «Музыкальная история». Х/ф. 8.40 Мультфильм. 9.00 «Необычайные приключения доктора Дулиттла». 9.30 «Пойми меня». 10.00 «Война в космосе». С. 4. 10.45 От «Винта». 11.00, 15.00 Сегодня днем. 11.15 Х/ф «Последний суд». 13.30 Звезды в квадрате, или Проще простого. 14.10 Живые новости. 14.30 «Панорама». 15.20 «XX век в войнах». «Блицкриг». 16.20 Сериал по выходным. «Саванна». 17.15 Новости дня с Натальей Антоновой. 17.30 Дог-шоу. 18.00, 21.00 Сегодня вечером. 18.30 Х/ф «Флэш Гордон». 20.45 «Куклы». 21.45 «Байки из склепа». 22.35 «Империя страсти». 23.15 «Футбольный клуб». 0.05 Открытое первенство США по теннису. 0.30 Ночной канал. «Плейбой-шоу».

8 канал

15.00 Джойс Майер «Жизнь в слове». 15.30 Ералаш. 15.45 Документальный экран. 16.45 Х/ф «Не будите спящую собаку». 18.45 Мультфильм «Три кабальеро». 20.00 «Комиссарша». 21.00 Документальный экран. 22.00 Х/ф.

НЯДЗЕЛЯ 31 жніўня

БТ

8.00 «Коктейль по воскресеньям». 9.05 «От сердца к сердцу». 9.30 Мультиклуб. 9.50 Вершина мира. 10.25 «Все нормально, мама!» 11.00 Турообъектив. 11.20 «Война в воздухе». 11.45 Сельчане. 12.15 Накануне будущего. 13.00 Олимп. 13.20 «Романсы на стихи М.Цветаевой». 13.45 «Сто лет и вся жизнь». 14.15 «Аплодисменты». 15.00 Новости. 15.20 «Моцарт и Сальери». Спектакль. 16.55 «Оскар». 17.30 Х/ф «Белые ночи». 19.05 Бездельник. 19.40 Колыбельная. 20.00 Резонанс. 20.50 Спортивный телекурьер. 21.10 Телебарометр. 21.25 Ток-шоу «Карамболь». 22.00 Х/ф «Анна Каренина». 0.15 Бархатный сезон.

ОРТ

7.00 Х/ф «Чудак из 5 «Б». 8.25 Мультфильмы «Золушка», «Маша и волшебное варенье». 8.55 Спортлото. 9.00 Новости. 9.10 «Непутевые заметки» Дм.Крылова. 9.30 Пока все дома. 10.10 Утренняя звезда. 11.10 Армейский магазин. 11.40 Играй, гармонь любимая! 12.10 Сельский час. 12.35 «Подводная одиссея команды Кусто». «Мыс Горн: воды ветра». 13.25 Смехопанорама. 14.00 Новости. 14.15 «Приглашение к музыке». 14.45 Клуб путешественников. 15.30 Мультфейерверк. 16.20 Счастливый случай. 17.15 Лучшие автомобили мира в Москве. 17.45 Футбольное обозрение. 18.15 Песня-97. 18.55 Погода. 19.00 «Строго на юг». 19.45 Киноафиша. 20.00 Время. 20.40 КВН-97. 23.00 Новости. 23.15 Х/ф «Кара небесная».

Канал «Россия»

7.00 Утренний экспресс. 7.55 Торговый дом «Ле Монти». 8.10 «Солти». 8.35 «У всех на устах». 8.50 Доброе утро, страна! 9.30 Присяга. 10.00 Вести в одиннадцать. 10.15 Русское лото. 10.55 Без пяти двенадцать. 11.00 Книжная лавка. 11.30 Человек на Земле. 11.55 Новая Россия. 12.15 Мультфильмы. 12.30 Наш сад. 13.00 Вести. 13.20 «Арабелла возвращается, или Румбурак — король страны сказок». Х/ф. 14.20 Сад культуры. 14.45 Погода. 14.50 Волшебный мир Диснея. 15.45 Репортаж ни о чем. 15.55 Довгань-шоу. 16.25 Футбол без границ. 16.55 Легенды Большого. 17.45 L-клуб. 18.20 «Аншлаг». 19.00 Зеркало. 20.00 Старая квартира. 1954 год. 21.05 «Сюжет». 22.00 У Ксюши. 22.30 Чемпионат Европы по вольной борьбе. 23.30 Мастер-ралли-97. 23.45 Спаси и сохрани. 24.00 «Женщины на крыше». Х/ф. 1.25 Ночная жизнь городов мира. Копенгаген.

Санкт-Петербург

9.30, 12.30, 15.30 Информ ТВ. 9.45 Папа, мама, я — спортивная семья. 10.15 «Все о тебе». 10.40 «Индаба». 11.10 «Долина хайраков». 12.00 «Собеседник сердца». 12.45 «Песни памяти моей». 13.05 «Учитель пения». Х/ф. 14.35 Монтсеррат Кабалье в России. 15.45 Спортивное обозрение. 16.05 «Каша-малаша». 16.25 Весь этот цирк. 16.55 Телестанция «Моя Россия». 17.25 Телемагазин. 18.30 Обратный отсчет. 19.00 «В старых ритмах». Х/ф. 20.20 Экспресс-кино. 20.45 Ноу смокинг. 21.30 У всех на виду. 21.45 Международное обозрение. 22.20 VI Всемирная ярмарка «Российский фермер». Дневник. 22.30 «Бал королевы песни».

НТВ

7.00 Сегодня утром. 7.15 Х/ф «Воздушный извозчик». 8.30 Мультфильм. 9.00 Устами младенца. 9.30 «Пойми меня». 10.00 «Война в космосе». С. 5. 10.45 От «Винта». 11.00, 15.00 Сегодня днем. 11.15 6 соток. 11.30 Что почем. 12.00 «Когда государство убивает». С. 2. 12.30 Книжный магазин. 13.00 «Каролина в Нью-Йорке». 13.30 Кино, кино, кино: новости Голливуда. 14.00 Время «Ч» с Ольгой Кучкиной. 14.30 «Своя игра». 15.20 «Выборг-97»: кинофестиваль «Окно в Европу». 16.20 «Саванна». 17.15 Новости дня с Натальей Антоновой. 17.30 «Русские гвозди». 18.00, 21.00 Сегодня вечером. 18.30 «Джеймс Бонд — агент 007». «На секретной службе ее величества». 21.40 Х/ф «Грех. История страсти». 23.40 Открытое первенство США по теннису. 0.10 Ночной канал. «Плейбой-шоу».

8-й канал

15.00 Благая весть с Риком Реннером. 15.30 Ералаш. 16.00 Х/ф «Последний раз, когда я видел Париж». «Танец с Оливией». 19.30 Трюкачи Голливуда. 20.00 «Комиссарша». 21.00 Империя духа. 21.45 Новости «К-видео». 22.15 Х/ф «Отходная молитва».

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

СЕКТЫ

Асцярожна: дыянэтыка!

У Мінску ў падземным пераходзе каля ГУМа стаіць малады чалавек, які раздае невялічкія ўлёткі з прапановай бясплатна прайсці тэст па Оксфардскіх методыках на велічыню інтэлектуальнага ўзроўню — IQ. Самае лепшае, што вы можаце зрабіць, — успомніць, што бясплатны сыр бывае толькі ў мышалоўцы.

Тэсціраванне праводзіцца ў штаб-кватэры «Царквы саенталогіі». Там жа вам прапануюць прайсці курсы самапаляпшэння. Не згаджайцеся, бо інакш вы патрапіце ў лапы авантурыстаў сусветнага маштабу.

«Царква саенталогіі» (ці «дыянэтыкі»), — магутная арганізацыя з філіямі ў 120 краінах свету. Па словах саміх «саентолагаў», іхняя царква штодня зарабляе ад 1 да 1,5 мільёнаў долараў. Па сведчаннях з іншых крыніцаў, даход «саентолагаў» складае каля 100 мільёнаў долараў у год. Напэўна, гэта самае ўдалае спалучэнне рэлігіі і камерцыі. Але і вельмі небяспечнае для кліентаў. Як сцвярджаюць псіхолагі, «дыянэтыка» не мае сабе роўных па тэхніцы ўздзеяння на свядомасць чалавека.

Што прапаноўвае «дыянэтыка»? На самой справе гэта сумесь звестак з псіхалогіі, акультызму і навуковай фантастыкі. Згодна з ёю, у кожным чалавеку існуе бессмяротны дух — «тэтан», які можа павольна перамяшчаецца па сусвеце. Але яму перашкаджаюць «інграмы» — запісы ў чалавечым мозгу, зробленыя ў стрэсавых сітуацыях. «Саентолагі» прапануюць зняць гэтыя «інграмы» падчас сеансаў «одытынгу». Канчатковая мэта «дыянэтыкі» — чалавек без «інграм», яго называюць «клір» (ад англійскага *clear* — «ясны»). Залішне казаць, што такіх няшмат. Для таго, каб стаць «клірам», трэба прайсці восем ступеняў «яснасці». Кожная ступень каштуе ўсё больш і больш грошай.

Напрыклад, адзін з пачатковых курсаў — «Трэніровачныя практыкаванні для одытараў» разлічаны на 52 гадзіны і каштуе каля 60 долараў (цэны беларускай філіі). Падчас заняткаў ад вас патрабуецца, напрыклад, сядзець адзін насупраць аднаго на працягу адной-дзвюх гадзінаў з заплюшчанымі вачыма, потым з адкрытымі і ніяк не рэагаваць на знешнія раздражняльнікі. На іншых занятках вы можаце гадзінамі расказваць адно і тое ж. У выніку, па словах аднаго з навучэнцаў, можна пазбавіцца насмарку. На курсе «Поспех шляхам зносін» (ён каштуе каля 40 долараў) вас навучаць размаўляць, пазбягаючы прамых адказаў на пытанні. Гэта добрая практыка для будучага камерсанта ад рэлігіі.

У працэсе навучэння «саентолагі» выпрацоўваюць у «прэкліраў» (тых, хто яшчэ не стаў «клірам») моцную залежнасць ад сваёй царквы. Спачатку чалавеку проста падабаецца там займацца, ён адчувае аблягчэнне і пачуццё ўпэўненасці ў сабе. Але потым ён пакрыху прызвычайваецца і ўжо больш не можа жыць без «дыянэтыкі». Гэта як наркотык. Каб мець магчымасць наведваць заняткі, трэба недзе шукаць грошы. Іх тут патрабуюць вельмі настойліва. Адна з магчымасцяў зарабіць — працаваць пазаштатным супрацоўнікам «Царквы саенталогіі». Такі супрацоўнік, калі ён здолее прывесці ў царкву новага кліента, можа атрымаць 10—15% ад той сумы, што заплаціў кліент. Але «саентолагі» вельмі неахвотна разлічваюцца наяўнымі грашыма. Часцей за ўсё яны проста прапаноўваюць замест грошай прайсці яшчэ адзін курс. Пасля такой інтэнсіўнай апрацоўкі чалавек губляе сэнс свайго жыцця. Вядомыя выпадкі самагубства людзей, у якіх «саентолагі» патрабавалі грошай на далейшыя заняткі.

Заснавальнік «саенталогіі» — Лафает Рон Хабард, былы афіцэр ВМС ЗША. Пасля Другой сусветнай вайны ён пачаў пісаць дрэнныя навукова-фантастычныя раманы, каб зарабіць на жыццё. Але потым зразумеў, што рэлігія можа прынесці куды больш грошай. У 1950 г. Хабард выпусціў кнігу «Дыянэтыка: сучасная навука душэўнага здароўя». Спачатку ён нават паспрабаваў прадставіць «дыянэтыку» як навуку. Але пасля адмоўнай рэакцыі навукоўцаў хутка перабудаваў яе ў рэлігію. Дарэчы, у Амерыцы ўсё, што датычыць рэлігіі, не абкладаецца падаткамі. Таму «бізнэс» Хабарда хутка развіваўся.

У многіх краінах свету Хабард прызнаны злачынцам. Вярхоўны суд Каліфорніі (ЗША) прызнаў ягоную секту «шызафрэнічнай і паранаідальнай». У Германіі дзейнасць царквы саентолагаў забароненая, а ў Францыі ўсё кіраўніцтва ліёнскай філіі «Царквы саенталогіі» апынулася за кратамі — іх абвінавачваюць у «вымагальніцтве і давядзенні чалавека да самагубства». Аднак у краінах СНД «Царква саенталогіі» дзейнічае даволі паспяхова і без перашкодаў з боку ўладаў.

Лявон ХАБАРАЎ

СПОРТ

Прайгралі, але не здаліся

Да матчаў са зборнымі Швецыі нашыя каманды падышлі з дыяметральна процілеглымі паказчыкамі: маладзёжная лідзіравала сярод дружын 4-й адборачнай групы чэмпіянату Еўропы, нацыянальная замыкала табліцу той жа 4-й групы, але ў першынстве свету. Магчымая перамога «маладзёжкі» працэнтаў на 60 вырашыла б задачу выхаду ў чвэрцьфінал еўрачэмпіянату, бо менавіта шведы праследавалі нашых, адстаючы толькі на ачко.

Але, на жаль, праблемы пачаліся яшчэ да гульні. Траўміраванымі аказаліся самыя таленавітыя з маладых Аляксандр Чайка і Мікалай Рындзюк, які стаў «палачкай-выручалачкай» і ў сваім клубе БАТЭ (Барысаў), і ў зборнай. Тыя ж, хто выйшаў у стартавым складзе, выглядалі малаарганізаванай аморфнай масай. У адрозненне ад гаспадароў шведы рабілі ўражанне згуртаванага мабільнага калектыву, у якім кожны ігрок добра ведае, што ён павінен рабіць. Беларуская абарона трашчала па швах, але дзіры паспяваў латаць варатар Уладзімір Гаеў. Выстраіць атакуючыя дзеянні беларусаў і надаць ім асэнсаванасць не было каму. Адзіны, хто быў на гэта здольны, Вадзім Скрыпчанка, — футбаліст, які мае дар дыспетчара, быў «сасланы» на левы фланг. Толькі усмешлівая фартуна да перапынку зберагала нашыя вароты ад гола.

У другім тайме не адразу, але з'явіліся на полі Рындзюк і Чайка. Іх намаганнямі і былі арганізаваныя самыя небяспечныя моманты каля варот гасцей. Але было ўжо позна: у сярэдзіне другой паловы матча шведы дабіліся поспеху і без асаблівых цяжкасцяў зберaглі пераможны лік 1:0. Нашыя ж, прайграўшы ключавы матч, саступілі не толькі лідэрства, але і другі радок у табліцы: Эстонія—Аўстрыя — 0:1. Крыўдна, але лагічна.

	Г	М	А
1. Швецыя	7	16—6	18
2. Аўстрыя	7	18—7	16
3. Беларусь	7	13—4	16
4. Шатландыя	8	8—13	7
5. Латвія	7	2—10	5
6. Эстонія	8	3—20	1

У падтэксце паядынка нацыянальных каманд ляжаў намер шведаў дасягнуць перамогі, бо толькі такі вынік дазваляў скандынавам разлічваць на выхад у фінальную частку чэмпіянату свету-98.

З самага пачатку госці захапілі ініцыятыву: у цэнтры поля гаспадарылі Аляксандэрсан, Зэтэрберг, Тэрн, Андэрс Андэрсан. Імклівымі перамяшчэннямі і распасоўкай яны імкнуліся заблытаць абарону беларусаў і прабіць яе для галявых рэйдаў Даліна і Петэрсана. Але хутка высветлілася, што нашыя абаронцы добра арыентуюцца ў «шведскім лабірынце». Сяргей Штанюк і Андрэй Астроўскі выйгралі «паветраную вайну», Вячаслаў Гарашчанка надзейна страхаваў партнёраў на пазіцыі вольнага абаронцы, а Сяргей Ясковіч з дапамогаю цёзкі Гурэнкі не толькі спраўляўся з Даліным, але і нярэдка падтрымліваў партнёраў у атакуючых набегах. Вельмі добра дзейнічаў у варотах Валерый Шанталосаў. Асноўная праца атрымлівалася горш: Міраслаў Рамашчанка спазняўся з прыняццем рашэнняў, а ў адборы і ён, і Валянцін Бялькевіч былі не вельмі ўпартымі. Прынамсі, Бялькевічу часам удаваліся футбольныя мініяцюры і эфектыўнае ўзаемадзеянне з калегамі. Горш за іншых глядзеліся форварды Сяргей Герасімец і асабліва Пётр Качура, які, як здалося, быў не гатовы да матча ні фізічна, ні псіхалагічна.

На 39-й хвіліне непаўторны па прыгажосці і дзёрзкасці рэйд здзейсніў Гурэнка. Перамясціўшыся справа ў цэнтр, абыгрываючы па ходзе сапернікаў, ён уварваўся ў штрафную і ашаламіў 38-гадовага галкіпера шведаў Томаса Равэлі — 1:0.

У другім тайме характар гульні змяніўся. Шведы яшчэ павялічылі хуткасць. Вельмі ўдала ўвайшлі ў гульню Еспер Бломквіст і знакаміты бамбардзір Кенет Андэрсан. Татальныя атакі гасцей пры страце мяча агалялі тылы, але контратакуючыя праходы Бялькевіча, Герасімца, Рамашчанкі вызначаліся прамалінейнасцю і індывідуалізмам. А хуткасных форвардаў бабруйскай «Белшыны» Дзмітрыя Балашова і Андрэя Хлебасолава, якія выйшлі на замену, легіянеры знарок ці незнарок «не заўважалі». Да сярэдзіны другога тайма стала відаць, як нашыя «тармозяць». Колькі ўжо разоў сапернікі каралі беларусаў і ў зборнай, і на клубным узроўні за нізкую функцыянальную гатоўнасць. На 78-й хвіліне далі бесперашкодна прабіць па варотах Кенету Андэрсану — 1:1. А за 3 хвіліны да сканчэння матча Зэтэрберг, бліскуча зрабіўшы штрафны ўдар, устанавіў справядлівы, але горкі для нас вынік — 1:2.

Зборная Беларусі згуляла адзін з лепшых матчаў у сваёй гісторыі, але клас шведаў аказаўся значна вышэйшы. Галоўны трэнер зборнай Міхаіл Вергеенка на пасляматчавай прэс-канферэнцыі адзначыў, што каманда прагрэсіруе, ігракі ў большасці толькі падыходзяць да піку сваёй кар'еры, значыць, можна спадзявацца на будучае. Дай жа Бог!

У Таліне зборная Эстоніі была разгромленая камандай Аўстрыі — 0:3. Хет-трык на рахунку Антона Польстэра.

4 група

	Г	М	А
1. Шатландыя	8	9—2	17
2. Аўстрыя	7	11—4	16
3. Швецыя	7	14—8	15
4. Латвія	7	9—11	7
5. Беларусь	7	4—12	4
6. Эстонія	8	4—14	4

У 1-й еўрапейскай групе Боснія сенсацыйна выйграла ў Даніі, ды яшчэ як — 3:0. У 7-й Турцыя з дваровым лікам 6:4 абыграла Уэльс.

3 група.
Нарвегія—Фінляндыя — 4:0.
Венгрыя—Швейцарыя — 1:1.

5 група.
Балгарыя—Ізраіль — 1:0.

6 група.
Чэхія—Фарэры — 2:0.

8 група.
Румынія—Македонія — 4:2.
Ісландыя—Ліхтэнштэйн — 4:0.
Ірландыя—Літва — 0:0.

9 група.
Украіна—Албанія — 1:0.
Партугалія—Арменія — 3:1.
Паўночная Ірландыя—Германія — 1:3 (Бірхоф — 3).

Пасля чарговай перамогі зборная Румыніі забяспечыла сабе ўдзел у фінальнай стадыі сусветнага чэмпіянату, далучыўшыся да каманд Бразіліі, Францыі, Марока, Туніса, Нігерыі, Камеруна і ПАР.

ПЛАВАННЕ:
ГУКАЎ — ГЭТА ГУЧЫЦЬ!

Чэмпіён свету і Еўропы ў 25-метровых басейнах мінчанін Аляксандр Гукаў упершыню перамог і на «доўгай» вадзе: у Севільі (Іспанія) ён стаў пераможцам еўрапейскага першынства на дыстанцыі 100 метраў брасам.

Сямён ПЛОЦ

Даты і лёсы

22 жніўня

1642. У Англіі пачалася грамадзянская вайна. Кароль Карл І, які быў адхілены ад улады парламентам па абвінавачванні ў тыраніі, на чале некалькіх соцень раялістаў узняў паўстанне ў Нотынгеме. Парламенцкія войскі, што складаліся пераважна з пурытанаў і ішлі ў бой спяваючы псалмы, у некалькіх бітвах разграмілі каралеўскую армію. Карл трапіў у палон і ў 1649 г. узышоў на эшафот. Дарэчы, горад Нотынгем з'яўляецца пабрацімам Мінска.

1862. Нарадзіўся французскі кампазітар-імпрэсіяніст Клод Дэбюсі. У ягоных аркестровых творах мелодыя ў нашым звыклым разуменні часта адсутнічае, яна звужаецца да некалькіх гукаў, часам двух-трох. Дэбюсі лічыцца бацькам музычнага авангарду.

1941. Дзяржаўны камітэт абароны СССР прыняў пастанову пра выдачу з 1 верасня ўсім чырвонаармейцам і камандзірам, што ўдзельнічаюць у баях, па 100 грамаў гарэлкі штодня.

1957. Нарадзіўся шматразовы чэмпіён свету па більярдзе Стыў Дэвіс, які першым выйграў больш за мільён фунтаў стэрлінгаў за адну гульню. Разам са стаўкамі расце і цікавасць гледачоў да більярда — на Захадзе ён збірае ўжо велізарную тэлеаўдыторыю.

1985. У манастыры Лірыён у Афінах памерла 15-гадовая паслушніца Стаматула, якая пры росце 67 см мела вагу ўсяго 5 кг. Верагодна, яна была хворая на сіндром Секела («птушкагаловую нізкаросласць»). Ахвяры гэтай хваробы звычайна маюць пукатыя вочы і доўгія насы.

23 жніўня

410. Вестготы на чале з Аларыхам узялі штурмам і разрабавалі Рым. Падзенне Вечнага горада ашаламіла многіх. *«Мой голас дрыжыць, і плач душыць горла, пакуль я дыктую гэтыя словы*, — стагнаў святы Еранім у Палестыне. — *Ён заваяваны, гэты горад, які скарыў увесь свет»*. Прыхільнікі старых культаў вінавацілі ў трагедыі хрысціянаў, якія выгналі з Рыма ягоных багоў-заступнікаў. Святы Аўгустын у творы «Пра Горад Божы» зняў з хрысціянаў віну за гэтую падзею: заняпад наканаваны ўсяму зямному.

1847. Памёр беларускі і польскі паэт, фалькларыст Ян Чачот.

1917. Нарадзіўся народны паэт Беларусі Пімен Панчанка. Лепшая ягоная кніга, напэўна, — «Пры святле маланак» (1966, дзяржпрэмія імя Я.Купалы), поўная глыбокіх роздумаў «пра сябе, пра людзей, пра долю».

1919. Пасланы генералам Юдзенічам карны атрад арыштаваў у Пскове штаб корпуса беларускага генерала Булак-Булаховіча. Прычынай канфлікту было тое, што Юдзеніч схіляўся да манархістаў, а Булаховіч — да эсэраў. Чырвоная Армія скарысталася становішчам і праз тры дні захапіла Пскоў.

1927. Два амерыканскія анархісты італьянскага паходжання Нікола Сака і Барталамеа Ванцэці былі прыгавораныя па абвінавачванні ў рабаўніцтве і забойстве да электрычнага крэсла. Па ўсім свеце пракацілася хваля маніфестацый пратэсту, бо абвінавачванне было ілжывым, і неўзабаве нават выкрылі сапраўдных злачынцаў — банду Марэлі. Тым не менш суддзя адмовіўся пераглядаць справу. Сака і Ванцэці былі афіцыйна рэабілітаваныя губернатарам Масачусетса толькі праз 50 гадоў.

1991. Прэзідэнт Расіі Б.Ельцын выдаў указ пра спыненне дзейнасці камуністычнай партыі РСФСР за падтрымку спробы дзяржаўнага перавароту.

24 жніўня

1572. Падчас Варфаламееўскай начы ў Парыжы каталікі забілі больш за 3 тысячы гугенотаў (кальвіністаў). Правадыр гугенотаў Генрых Наварскі выратаваўся тым, што пагадзіўся перайсці ў каталіцтва. Папа Рыгор XIII, калі яму паведамілі пра пабоішча, узрадавана сказаў, што гэтая вестка яго цешыць больш за 50 перамог над туркамі. Трохі нечакана сваё абурэнне падзеямі Варфаламееўскай начы ў лісце да імператара Максіміліяна II выказаў рускі цар Іван Жахлівы.

1814. Брытанскія войскі на кароткі тэрмін захапілі новую сталіцу ЗША Вашынгтон і спалілі Белы дом і Капітолій.

1946. Бюро ЦК КПБ разгледзела пытанне «Аб рэпертуарным плане тэатраў БССР», у выніку чаго быў узмоцнены кантроль за дзейнасцю тэатральных калектываў. На працягу шэрагу гадоў бюро ЦК зацвярджала іхні рэпертуар, які можна было змяніць толькі з партыйнага дазволу.

1954. Прэзідэнт Бразіліі 71-гадовы Гетулія Варгас, якога апазіцыя надта дапякла патрабаваннямі пайсці ў адстаўку, скончыў жыццё самагубствам.

1991. Каля 10 гадзінаў вечара ў крамлёўскім службовым кабінеце быў знойдзены павешаным маршал і дарадца прэзідэнта СССР Сяргей Ахрамееў, які падтрымаў ГКЧП. Следства прыйшло да высновы, што гэта было самагубства. Тым не менш многія мяркуюць, што прафесійныя вайскоўцы самі ніколі не лезуць у пятлю, а толькі страляюцца...

25 жніўня

325. Па ініцыятыве імператара Канстанціна быў скліканы першы агульнахрысціянскі сабор у Нікеі, які распрацаваў правілы вылічэння штогод іншай даты Вялікдня. Апрача таго, сабор асудзіў арыянскую ерась, паводле якой Хрыстос быў сынам не Бога, а чалавека.

1530. Нарадзіўся Іван IV Жахлівы, першы рускі цар з 1547 года. Іван (дарэчы, па маці беларус) значна пашырыў межы сваёй дзяржавы — заваяваў Астраханскае, Казанскае і Сібірскае ханствы, а на пэўны час і Беларусь, але больш праславіўся крывавымі рэпрэсіямі супраць баяр, царквы, уласнай сям'і і нават цэлых гарадоў.

1930. Нарадзіўся шатландскі акцёр Шон Конэры — лепшы выканаўца ролі Джэймса Бонда ў першых сямі фільмах пра агента 007, пачынаючы з «Доктара Не» (1962).

1936. Пасля першага ў СССР вялікага адкрытага працэсу над «ворагамі народу» былі расстраляныя ўсе 16 падсудных, у тым ліку Рыгор Зіноўеў, разам з якім Ленін хаваўся ў Разліве ад паліцыі ў 1917 г.

1991. «Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі» ад 27 ліпеня 1990 г. быў нададзены статус канстытуцыйнага закона. Вярхоўны Савет прыняў пакет рашэнняў аб эканамічнай і палітычнай самастойнасці Беларусі, аб часовым прыпыненні дзейнасці КПБ і нацыяналізацыі ўласнасці партыі і камсамола. Міністэрства ўнутраных справаў і КДБ Беларусі былі выведзеныя з падпарадкавання Маскве. Старшыня Вярхоўнага Савета Мікалай Дземянцей ладаў у адстаўку. Што казаць, дзень быў плённы, але можна было зрабіць і больш...

© СВАБОДА Падпісны індэкс 63887 E-mail: edit@svaboda.minsk.by СВАБОДА ў Internet: http:\\www.gis.minsk.by Спасылка на газету СВАБОДА абавязковая Наклад 90.000 (першы завод — 35.380)
Нумар падпісаны ў друк 21.08.97 (15:00) Надрукавана на паліграфічнай фабрыцы «Чырвоная зорка» (г.Мінск, 1-шы Загарадны завулак, 3) ЛВ № 215 Заказ 344